ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ

Цэна асобнага № 15 кап.

Умовы падпіскі на 1917 год.

За 1 м-ц	За 2 м-ц.	За 3 м-ц.	За 4 м-ц	За 5 м-ц.	За 6 м-ц.	За 7 м-ц.	За 8 м-ц.	За 9 м-ц.
1.50 к.	3 р.	4 р.	5 р.	6 р.	7 р.	8 р.	9 р.	10 р.

Падпіска прымаяцца толькі с 1-го чысла кожнага месяца.

Перамена адрэсу—50 коп. Пры зьмені адрэса конча прыкладаць стары адрэс.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны і толькі з аднаго боку паперы. Кепска перапісаныя рукапісы ні чытацца, ні друкавацца ня будуць.

На ліставання, перасылку рукапісау і іншыя адказы-павінны прыкладацца маркі.

Газэта палітычная, экономічная і літэратурная.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Мінск, Захар'еуск. 18.

Умовы друку абвестак:

(На IV боку газэты) за 1 радок шпальту 40 к.
„ 2 „ „ 80 к.
за кожны раз.

Асобам, шукаючым працы—1 руб. за 3 радкі за адзін раз.

№ 1. (Нядзеля) Выходзіць двойчы на тыдзень. (28 мая). № 1.

„Вольная Беларусь“


...Беларусь, Беларусь!
Агнем імя твае мне гарыць,
С песьні ласкаю маткі нясецца:
Ясным сонцам у размові стаіць
І грымотай у гнеу раздаецца!
Як нявехна у кіроднай сямы,
Ты пасагу сабе ня падбала,-
Залатыя кляйноты свае
Упыху сестрам сваім дaравала.

Калі мы азнаемімся з вялікай кнігай гістарычнаго лесу народау, дык хутка пабачымо і пракананямся, што ніводная нацыя, ніводзін народ на сьвеці ня меу горшаго жыцьця, горшае гістарычнае долі, як наша старонка, нашая родная Маці-Беларусь. Адтрымаушы становішча паміж розных народау, яна нікога ня чапала, ні на кога ніколі ні нападала, ні с кім ня змагалася, а толькі баранілася, ратавала свае жыцьце, сваю нацыональную самабытнасьць, покі хапала сілы, покі была змога і магчымасьць. І мо' за гэта завецца яна ні вялікая, ці малая, ні чорная ці чырвоная, а **Белая Русь**, чыстая, сьветлая, як бель-беляваная, бяз плям зайдрасьці, бяз зьдзірства і зьдзеку.

Але і слауная мінуушчына нашага краю! -

У той час, як на Маскоушчыні стаяла страшэнная цемра,-у нас панавалі навука, прасьвета, шырока квітнела грамадзянскае жыцьце. Цемныя людзі Маскоускаго царства грамілі друкарні, гасілі прасьвету, баяліся кнігі нірауноючы, як чумы ці халеры, тагды як наша грамадзянства, ні здавальняючыся уласным выхаваньням, пасылала дзяцей сваіх да вышэйшых навук заграніцу, дзеля большай адукацыі, дзеля лепщаго выхаваньня. І лепцыя, асьвечнейшыя людзі Масквы, як Курбскі, напрылкад, або Мсціславяц ці Тодар Друкар, хаваючыся ад раз'юшаннаго патоупу, шукалі ратунку у нашай бацькоушчыні і знаходзілі тут братэрскі прывет і пашану. Відаць, што на той час Беларусь была для Маскоушчына, як Швайцарыя ці Францыя нашаго часу, куды уцякалі ад царскаго гневу лепшыя людзі да рэволюцыйнай Расеі. Наагул, нацыональная культура на Беларусі тагды стаяла досыць высока, істнувала рэлігійная вольнасьць, ня было нацыональнаго уціску, і жыдэ, напрыклад, мелі роуная права з усімі людзьмі Літоуска-Рускаго гасударства. У 1517 годзі Францішак Скарына узяу на сябе справу вялікае вагі,-перэклау і выдау Біблію на Беларускай мові «ку лепшаму,» як ен пісау: „выразумленію люду паспалітаго“. Прауда, ні натта ужо проста і зразумела яна перэкладзена, шмат мае царкоуна-славянскіх зваротау, але гэта была эпоха у культурным жыцьці беларусау, асабліва калі узяць на увагу шырокую публістычную літэратуру таго часу і атправы набажэнства па беларуску. Культура на Беларусі цьвіла і рунела і, каб ня стрэла на шляху сваім цяжкіх варункау агульнаго жыцьця, дык наизуны яна дауно стаяла-б нарауне с культурай Заходнай Эуропы.

Ды ні так яно сталася, як жадалася. Беларусь зауседы была прынаднай краінаю, смачнаю лустай, і суседзі грызьлі яе з усіх бакоу. Немцы, або крыжаке, маскоуцы ці паляке,-тыя ці другія скублі яе адтуль ці адгэтуль. А народ наш спакон веку быу ціхі і лагодны. Ен ня любіу ваяуніцтва і больш здольнасьці мае да сахі на полі, або да пяра на паперы. Ваяуніцкая шабля яму ні да густу. Сумныя песьні яго поуныя скаргі і жалю на ваенную калатніну. Тым часам палітычнае жыцьце вымагае саусім іншага. Хто хоча абараніць сваю самабытнысьць і захаваць палітычную нізалежнасьць, той павінян ня толькі бараніцца, але мусіць і сам нападаць ды заваеуваць, чаго беларусы па сваяму лагоднаму характару рабіць ня маглі і ня хацелі. Мэрам ведаючы гэта, суседзі дарэмна часу ня марнавалі і добрых людзей ня шкадавалі. Амаль ня штогодна нападалі на нас, палілі вескі, нішчылі гарадэ, паляндравалі палеткі, гуртамі уводзілі людзей у няволю. Зямля курэлася ад крыві людзкой, засьцілалася неба дымам пажарау. Німа грунту такого, німа таго мейсца у нашай старонцы, дзе-б ня лілася кроу бацькоу нашых, дзе-б ня трухлелі косьці ворагоу нашых. Беларусь змагалася, як мага баранілася, але нічога ня удзела. Упарты быу вораг яе, дужаго і зайдросснаго дау Бог суседа ей. Дзеля змаганьня з немцамі яна злучылася да супольнаго жыцьця з Літвою ды разам з ею ратавала сваю бацькаушчыну. Дзеля гэтай-жа мэты ні раз едналася яна у хэуру с Польшчай, покі у страшэннай Грюнвальдскай батэліі немцы ні былі разбіты спрэс. Збавіушыся ад немцау, Беларусь тым часам сапачынку сабе ня знайшла. Трэ было бараніцца ад Польшчы і Масквы. Але адна яна спра-



М. А. БОГДАНОВІЧ.

(12 мая 1917 г.)

Плач, бедная маці Беларусь... Лій сьлезы—нядоля агарнула цябе... Ты страціла аднаго з найлепшых сыноу тваіх...

Асірацелі вы, нівы нашые, бары і пушчы...—

Той, каторы апевау вас у сваіх цудных лірычных песьнях, пайшоу да Бога...

Скончыуся вясной — на вясне жыцьця свайго, у самай раньней моладасьці, маючы усяго 26 гадоу...

Памер адзінокі, на чужыне, у Ялце, на берязі мора, дзе ен лечыуся ад сухотау.

Шмат ты ад яго спадзевалася, бедная Беларусь... Прауда, шмат ен і зрабіу, але мог яшчэ зрабіць болей.

С таго часу, як „упалі з грудзей Пана Бога, парваушыся пацеркі зор“, што „так маркотна і пільна на край мой радзімы глядзяць“, с таго часу ужо 8 гадоу, як ен пачау свае першые вершы у газ. „Наша Ніва“,—кожны з нас нецерпяліва чэкау усе новых і новых творау яго.

„Пацеркі зор“ с чужога Ярослауля чаравалі нас тонкасьцю і выразнасьцю сваей паэзіі.

Веяло ад іх васількамі, лесам, возерам... Веяло ад іх шчырым каханьнем, агневым пачуцьцем да роднаго краю... Плач нядолі чууся у іх:

«Кінь толькі вокам да гэтаго люду,
Сціснецца сэрцэ ад болю,-
Столькі пабачыш ты гора усюды,
Столькі нуды без патолі.

За усе гады сваей працы на роднай ніве Богдановіч дау нам багатую паэзію Роднай Беларусі. «Бытцым тысяча, крэпка нацягнутых, струн», звінела яго паэзія.

Нізкі вершау: „У зачарованным царстві“, „Згукі Бацькоушчыны“, «Старая Беларусь» і др. квітнеюць сваей вясновай пекнатой...

Некалькімі характэрнымі штрыхамі Богдановіч давау цэлы, жывы малюнак, нібы старасьвецкіе мосежные барэльефы с цуднымі орнаментамі.

Яго верш напраудзе «звініць як звон» і «іскры брызгаюць с халодных каменьняу»...

Апошніе гады Богдановіч унікся усей душой у дух старых, народных беларускіх матывау. Нібы той вадалаз, даставау з глыбі мора роднай мінэалегіі пэрлы сваей паэзіі.

Але яго пастаяннная хваравітасьць час ад часу ценямі смутку мелькала у яго творах:

«Шмат у нашым жыцьці есьць дарог,
А вядуць яны усе да магілы.»

За увесь час сваей літэратурнай працы ен часта у вершах успамінау аб тым, што ен хутка памрэ:

«Не кувай ты, шэрая зязюля,
Сумным гукам у бары.
Мо і скажэш, што я жыці буду,
Але лепш не гавары...»

Увесь час сэрцэ прарочыло яму сьмерць, бо „грудзі хворые“ і «боль у іх мне душу агартае».

«Прыляціж тады ты на магілу» — звертаецца вялікі песьняр да зязюлі на лад старасьвецкай беларускай песьні. У другім вершы паэт так жаліцца:

«Дауно ужо целам я хварэю
І хвор душой –».

Але адна надзея яго падтрымлівае:

«І толькі на цябе надзея,
Край родны мой!»

Ен звыкаецца с сваейхваробай, пераконаны, што іначэй быць ня можэ:

«Каліж у ім памру —, загіну —
Не жалюсь я!
Ня будзешь цяжкая ты сыну
Свайму, земля!»

Да апошніх дзен сваіх ен дбау не аб сябе, але аб долі гаротнаго народу свайго. І у пастаянным змаганьні сваім з рознымі праціунікамі беларускаго адраджэньня, паэт саусім забывауся аб сваей хваробе:

«У родным краю есць крыніца
Жывой вады.
Там толькі я могу пазбыцца
Сваей нуды»...

Богдановіч, апрача вершау, пісау яшчэ апаведаньні, крытыку літэратуры беларускай, публіцыстычные стацьці па расейску у розных журналах аб беларускім руху.

Цікавіуся ен і роднай сястрой беларусі — Украінай і вельмі важные працы друкавау у жур. «Украинская жизнь» аб рытміцы вершау розных украінскік паэтау.

Ляці, шэрая зязюля, з родных загонау Беларусі у далекую Ялту!

Закувай на адзінокай магіле найлепшаго, найшчырэйшаго сына Беларусі...

Кажы яму, што гаротная Беларусь ніколі яго не забудзе... На скрыжалях адраджэньня роднаго краю яго імя будзе зьяць у небі Беларусі сьветлай зоркай навекі!

Хай будзе табе легкая зямелька!

З. Бядуля.

віцца з імі ня магла. Трэ было шукаць іншае рады. Аб палітычных умовах Маскоускага царства хадзілі страшэнныя чуткі (Іоанн Грозны). Гістарычныя варункі вымагалі знайці сабе хаурусніка. І выбіраючы з двух ліх меншае, яна памірылася с Польшчай ды злучылася з ею, як роуная з роунай і вольная з вольнай. Але дабра ня бачыла. Увесь час супольнага жыцьця прайшоу у змаганьні с паленізацыяй (апалячваньням) і у бажанні выкарабкацца спадсусядзяу на шлях самабытнага жыцьця. Скончылася тым, што абедзьві яны папалі у цупкія рукі Маскоускаго царства...

У бязупынным змаганьні з нядоляй сваею Беларусь страціла усе: сваю палітычную нізалежнасьць, сваю школу, асьвету, законы (Літоускі статут) ды нават імя свайго забылася. Мы сталі нацыяй бяз імя, народам бяз прозвішча, гуртам «тутэйшых», „простых“ людзей, «дзядзькамі» з забраннаго краю. Народ змогся, страціу апошнія сілы ды мэрам заснуу летаргічным сном.

І мабыць у гэты страшэнны час цішы і нацыянальнай паняверкі ствaрылася казка пра забітаго брата. Апавядаецца яна ні у летку, як сьвет Божы грае й красуе, і ні у зімку, калі мароз і завіруха, а у час вялікаго посту, напрадвесьні, на пераддні нового жыцьця.

Мяне брацяйкі забілі,
Нож мне у сэрцайка усадзілі,
Чарапком вочы накрылі.
Ня грай, дудачка, ня грай,
Майго сэрца ня уражай!..

І апавядаецца у казцы гэтай, дзе дастаць тых лекау, дзе можна растарацца тае вады жывучае і гаючае, каб адратаваць забітаго брата.

Для нас, сучасных дзяцей Беларусі, тымі лекамі, тэй вадою жывучай і гаючай есьць наша беларуская мова і асьвета на грунці роднай культуры.

Вялікая Расейская рэвалюцыя паадчыняла дзьверы да вольнаго жыцьця ня толькі паасобістым людзям, але і цэлым нарoдам, усім пакрыуджаным і зьняважаным нацыям, а у тым ліку і нам, беларусам. Ад шчыраго сэрца вітаючы вольнасьць Дзержавы Расейскай, мы з набалелаю, пакутнаю душою рвемся да новаго жыцьця да культурна-нацыональнаго адраджэньня нашаго народу. Мы цьверда ведаем, што гэтакаго мамэнту двойчы ня будзе і што страцім цяпер, таго на найдзем ніколі. Наша сьвятая павіннасьць доуг кожнаго сьвядомаго грамадзяніна і беларуса на бавіць часу, а цяпер-жа, да склікання Установчаго Сэйму (Учредительнаго Собранья), аддаць свае сілы і розум на службу многопакутнаго народу. Ніхай запануе у душах нашых грамадзянін, шчыры сын сваей бацькаушчыны і усяго працавітаго народу. Пойдзем на вескі, на села, пойдзем на фабрыкі, заводы, у крамы, канцаляріі і панясем туды сьвятло **нацыональнай, палітычнай і грамадзянскай** сьвядомасьці. Мы ведаем, што трэ' будзя змагацца ня толькі з забабонамі чужынцау, але й з уласнаю цемрай, каторая спавіла нас чорнаю хмараю пад час панавання царскаго самадзержавія. Соткі год трымалі нас у кайданах нярволі, соткі лет атручывалі народ наш то польскасьцю, то маскоушчынай, і цемра наша да жаху страшэнна густая і вялікая. Народ блудзіць па ей, мацаючы і растыпыраючы рукі як сляпы бяз павадыра і прымае прыхільніка за ворага, а ворага за прыхільніка.

Цяжкі грунт нашай працы. Повян гвалту і нісподзевак шлях нашай будучыны. Мо ні раз разабьемся мы да крыві, ні раз заплачам мы горкімі слязьмі, але без конца вялікая вера наша у сьвятую справу нашу. І які-б лес ні спаткау па дарозі да нашае мэты, ніщто нас ня затрымае і супыніць ня можа. Да вялікай працы, браточкі, уставайця! Да змагання за аутаномію Беларусі, за дэмакратычную рэспубліку Дзержавы Расейскай!

Жыве вольная Беларусь!

У вялікі час выходзіць наша газэта...

Стары лад скончыуся і ня паустане боляй ніколі. Німа цара, німа зьдзеку, уціску і цаняверкі. Вышлі на волю барцы за вольнасьць і шчасьце народу. Расчыніліся дзьверы да сьветлай будучыны, у вялікі гмах братэрства, вольнасьці і згоды.

Расея стала на перэдні новаго жыцьця.

Параскіданы царскія троны, папарываны кайданы, паломаны шыбяніцы. Народ сам стау дзяржауцам сваім, царом жыцьця свайго. Устау ен, вялікі, магутны і вольны, падняу вочы поуны жалю і скаргі, азірнууся, уздыхнуу на усе грудзі ды загукау на увесь сьвет: «Братэ! хай кожны пасьпешае адно нам думаць і рабіць. Хто быстру рэчку затрымае, скуль сілу гэтаку дабыць»?

Расчыніліся дзьверы да вялікай майстарні, у кузьню новаго жыцьця. Народ будзе сам сваю долю каваць. І ніхто ужо ня стапе яму на дарозі, ніхто ня затрымае і ня спыніць яго, цара цароу і гаспадара гаспадароу.

Калом зямля яму, таму ладу старому! Будзь ен трэйчы праклятьі, лад крываваго царскаго панаваньня, лад шыбяніц вастрогау, засланьня, уладаства, цямноты, галоты, здірства і зьдзеку!

Мо нікому на сьвеці ня дауся ен гэтак у знакі, як нам, беларусам. Мала таго, што з нас высмактывалі кроу, але і дбалі пра тое, каб народ наш быу пайцямнейшы і паслухняны, як тая жывела.

Ні дарма-ж звалі нас «быдлам». Яны таптали чалавецтва наша, абсьмейвалі сакрамэнты душы нашай, зьдзекаваліся над мовай нашай і прагналі яе с школы, с судоу, з усіх інстытуцый. Заміж роднаго, з дзяцінства нам мілаго слова яны давалі спачатку нам польскую мову, потым расейскую або маскоускую і каб магчыма здаецца, дык далі-б нам татарскую, абы ямчэй сядзець на карку нашым, абы лягчэй смактаць кроу нашу. Бо бяз мовы, бяз роднаго слова, народ, як тоя быдля, з якім робяць, хто што хоча. Пад гумар жартуюць, а у злосьці катуюць. Припамятай беларусе, што с табою выраблялі!?

Каб апісаць усе атрамэнтам, дык загаласілі-б людзі лямэнтам...

Але народ, як спружына: чым мацней націскаць яе, тым раптоуняй выпроставаецца яна уверх і з нязьмернай сілай бье таго, хто ня здолау стрымаць яе.

Паустау народ і магутным рухам сваім разарвау вякавыя кайданы.

Як трухлявае дрэва разбілася на друзгі царскае самадзержавіе, гэты ідал крывавы, вінавайца нашаго гора, слез і пакуты. Зрабілася цуда. Раптам ні стала цароу, зьнікли прывілеі, усе сталі роунымі і вольнымі. Разам с тым, зьнікла як дым, і тая розніца, што дзяліла мову людзкую на панскую і мужыцкую. Усе яны і польская і расейская, як і наша беларуская, маюць права на жыцьце і пашану; усе роуныя і аднакія, німа паміж іх ні горшай, ні лепшай, як німа сярод роуных большаго ці меньшаго.

Дык устань, Беларус, пратры вочы свае і сьмела глянь на бел-божы свет!

Падай руку братэрскі суседу свайму, прывітайся да усіх, як роуны з роуным як вольны з вольным.

Будзь горд, Беларус! Ты маяш права, бо і твоя кроу лілася за вольнасьць дзержавы Расейскай. І твае дзеці ішлі на шыбяніцы, у вастрогі, на пакуту у засланне за вольнасьць, за шчасьце, за вольнасьць народа.

Будзь горд, Беларус! Ты маяш права на гэта, ты заслугавау пашану сабе ад суседа і ад усяго белаго сьвета. І твая цагліна лягла у падмуроуку агульнай вольнасьці, і твая сьвязіна цамэнтавала будынак лепшаго жыцьця.

Цяпер у нашых руках, наша будучына, ад нас самых залежыць скаваць сабе лепшую долю. Памятайце гэта, злучайцеся у гурткі, арганізуйця хаурусы. «Вздувайце горна, куйте смело, пока железо горячо»!

Моцна стойце на родным грунці! Любіце бацькаушчыну сваю усею душою, усім сэрцам сваім, бо хто матку забывае, таго Бог карае. Шануйце мову сваю, гэта скарб наш, моц і аздоба наша. Вучэцеся, чытайце; чужому навучайцеся але свайго ня выракайцеся. Даглядайця свайго, як маці дзіцяці.

Тварыце культуру сваю, шырце сьвядомасьць сваю! Тут наша спасеньне. Толькі на грунце роднай культуры мы пабудуем лепшае жыцьце, толькі пашана да роднай мовы завядзе нас на сьвет Божы. Інакш згінямъ, памром, як асобны беларускі народ, зробімся полям для чужынцау, тым брудным гноям, які узгадуе сьмярдзючая зямля на страх і агіду суседзям. Праклянуць нас дзеткі нашы і адракуцца добрыя людзі!

Да вялікай працы, браточкі, уставайце! Набліжаюцца выбары да Установчаго Сэйму. Наша сьвятая павіннасьць пасляць туды ні чужынцау, што прыехалі да нас у заработкі, ні палякоу ці расейцау, каторым край наш чужы і нявядомы, а сваіх, шчырых сыноу Беларусі, хто любіць яе, як самога сябе, хто будзя бараніць народ наш і інтарэсы яго ды ня спужаецца нікога і нічога, хто гатоу аддаць жыцьце свае за справу беларускую. Нам трэба паслаць да Сэйму такіх людзей, каторые парупяцца пра тое, каб Беларусь мела шырокае краевае самаупрауленьне ды упраулялася самы беларусамі, шчырымі дзяцьмі свае зямелькі, а ні тымі, хто адрэкаюцца ад нас і мовы нашай ды лічыць нас за расейцау, ці палякау Бойцеся людзей гэтых! Гэты зраднікі, рэнегаты, Юды, што гандлююць бацькоушчынай нашай паагул і паасобку. Выбірайця тых, хто шануе нас і мову нашу, хто будзе дбаць пра тое, каб у школах, царквах і касьцелах ды ва усіх інстытуцыях нашаго краю заводзілася наша родная беларуская мова. Выбірайце тых, хто моцна, аж да сьмерці, будзя стаяць за зямлю і волю народа, за культурна-нацыанальнае адраджэньня Беларусі, хто будзе стаяць за дэмакратычную рэспубліку Дзержавы Расейскай на фэдэратыунай падмуроуцы. Пасылайце да Сэйму **беларусау**!

Ніхай жыве вольная Беларусь!

Я. Л.-к.

Як Учынілася рэвалюцыя.

Рэвалюцыі чакалі дауно, і усе пэуны был , што яна хутка прыдзя. Тым часам паустала яна саусім ніуспадзеукі і загрымела, як пярун знячэуку. «Ніхто ня ведае ні дня, ні гадзіны, калі Сын Чалавечы зыдзя на зямлю судзіць людзей».

„Рыну“.

Было і зьвялося — сьвет іншы паустау,
А вось што мне дзед мой нябошчык казау.

У сяле была хата на дзьве палавіны,
Прасторны абедзьве, бы тые адрыны,
Але пустовала адна палавіна;
У ночы, як пойдзе а поуноч часіна,
Прыходзіць ціхутко туды Невядомы
Прыходзіць невідны, стаіць нерухомы
І толькі гаворыць; «Ой рыну ж я, рыну»,
І кожны, пачуушы такую навіну
Скарэй бег наущэкі, бег вон з гэтай хаты...
Што ты парадзіш? той дом быу закляты.
Чаго ні рабілі — вадой акрапялі,
Попоу і ксендзоу там маліцца склікалі;
А Рыну свае веу, і той дом пуставау
Аж покі салдата туды Бог не паслау.
Прыходзіць служывы. — Эй, добрые людзі;
Прыпынок салдату на ноч ці ня будзе?
І рады б, саколік ды ліхо такое:
Ня будзеш мець, усю ноч там спакою,
Есьць у нас хата але заклятая;
Там „Рыну“ усе ходзіць і сон адганяе,—
Патыліцу джургнуу салдат і гаворыць,
„Нехай сабе рыне, ня буду з ім спорыць“.
Паслалі салдату, як доброму пану
«Пабудзіце, братцы, як сам я не устану».
Салдат пацягнуся, выпростау ногі,
Салодка зяхнуу так, ведамо з дарогі—
Як пласт паваліушысь на мягкае сена,
(На усякі выпадак пад бок узяу палена),
Дауно не лежау так салдацік наш пышно;
Ляжыць ен спакойно, крыху такі сьціхно;
Але свае право усе ж сон забірае
І вочы салдату дрэмком засьцілае.
Вось поуноч падходзе — магільная ціша,
Замерло усе у сьвеці, здаецца ня дыхэ.
Салдат здрыгануся, прыслухауся — рыну.
Пабеглі мурашкі на плечы, на сьпіну,
А страх неадступно усе «рыну» ды — рыну!
Да так непрыемно, ды так надаедно.
Ня вытрываць, чуе, салдацік наш бедны.
Давай абувацца — забыу і палена.
І круціць анучы, прыгнуушы калена.
А тут, як на ліха і бот загубіуся
А «Рыну» над вухом бы шэршэнь убіуся,
І дудзіць ды дудзіць усе рыну. «Ой рыну».
Ну, не, брат; дарма ты, а бот я ня кіну,
Казенныя рэчы важней твайго «рыну».
Салдат аж пацее, хапаецца, рые;—
Німа таго бота, а рыну аж вые —
Німа з ім ратунку у проклятой хаці.
— Рынь! рынь же брадзяга! рынь, згінь твая маці,
Цярпеньня не стало, салдат узлавауся.
І што — ж? гэты Рыну у момэнт распауся.
Напоунілась хата у міг срэбраным звонам,
І сыпнулі грошы дождджом несшчысьленым.

Якуб Колас.

Русалка.

Маладзік—мой мілы.
Маці—песьня зор.
Сестрыкамі--рэчкі.
Братам—зелен-бор.

А мой легкі велім—
Воблачкі нябес.
А мае коралі—
Кроплі сьветлых рос.

Слухаць люблю шэпты
Маладых галін,
Цэлаваць лілеі,
Сэрцэйкі расьлін.

А мае падружкі
Казкі кажуць мне.
Распеваюць песьні
У ночнай цішыне.

Расплетаюць коскі
Ды у карагод,
Аж пакуль не блысне
Залатьі усход.

Ясакар.

Ужо 1905 год расхістау царскі трон, і с таго часу ен ледзьвя ліпеу. Але патрэбавалась 12 гадоу, каб народ праканауся, што стары лад згніу, што ен усе псуе і валтузіць і што гэтак даляй жыць нельга.

Ушчухалася страшэнная вайна. Лепшыя, багацейшыя часткі зямлі былі заваеваны немцамі. Армія адступалася, бо ня было чым бараніцца. Паустала дарагоуля. Пазнікалі тавары с крамау, ня стала хлеба на рынку. Дзяржава руйнувалася і сунулася у багну...

З лямэнтам «хлеба, хлеба» натоуп выйшау на вуліцы у Петраградзі. Да яго прылучыліся рабочыя, да рабочых салдаты. Усе бачылі, што ні скінуушы цара і самадзержаунаго панаваньня,—нічога ня зробіш. Дзяржава зруйнуецца і усіх чакае бязгалоу'я.

Палітычная вольнасьць патрэбна усім: і рабочым, і сялянам, багатым і бедным. Усе клясы і станы злучыліся разам і—мур царызма ня стрымауся. Што будавалася сотні год, — развярнулася у колькі гадзін. Ні дарма-ж заграніцаю ахрысьцілі нашу рэвалюцыю **цудам**.

23 лютага у Петраградзі натоуп вышау на вуліцу с крыкам «хлеба». На галодных людзей нацкавалі паліцыю. Але паліцыя ня магла запыніць магутнаго руху людзей. Пачаліся мітынгі, дэманстрацыі. Супыніліся фабрыкі, заводы. Рух нарастау. Паліцыя і жандармы пачалі страляць, салдаты адмовіліся. Рэвалюцыйны рух пачауся у войску.

26 лютага старшыня Г. Думы, Родзянка, зьвярнууся да цара с тэлеграмай, у каторай раіу яму скінуць зьнявідзяных народам міністрау і скласьці атпавядальны урад. Цар ня паслухау ды загадау нават распусьціць Думу.

27 лютага салдаты сталі злучацца с паустаушым народам. Каля 26 тысяч войска пайшло бараніць Думу. Іх ня пушчалі салдаты, каторыя ешчэ трымаліся за цара. Пачаліся бойкі. Былі страты людзьмі. Але усе-ж такі салдаты трапілі да Думы. Дума, углездзіушы, што народ яе падгрымае, ухваліла ня слухаць царскаго прыказаньня; ні разыходзіцца.

А рух рос і шырыуся. Народ захапіу арсэнал, адчыніу турмы ды вызваліу палітычных вязьняу. Стары лад затрашчау, захістауся і паваліуся. За між яго, з загню рэвалюцыі, паустау новы лад...

Гасуд. Дума выбрала Выканаучы Камітэт, каторы узяу кіраунацтва і уладу у свае рукі. У той жа дзень рабочыя склалі уласную арганізацыю. На фабрыках і заводах былі выбраны Рады рабочых дэпутатоу, каторыя моцна сталі на варці патрэб працоунаго народу, падбіваючы новы урад змагацца да рэшты с старым рэжымам.

28 лютага усе войска прылучылася да пароду. Былі арыштованы міністры ды пасаджаны у вастрог, дзе сядзяць да гэтаго часу, чакаючы суду і кары за зладзейскіяу чынкі свае

Тым часам, паліцыя яшчэ змагалася з народам, баронячы стары парадак. Па ранейшаму загаду міністра Пратапопава, на будынках, у падвалах, паграбох былі пастауляны цулеметы, і паліцэйскія, схавaушыся, стралялі у народ. Але гэта былі апошнія сударгі канаючаго царызму.

1 марта салдаты выбралі сваіх дэпутатоу і склалася вядомая усім Рада Раб. і Салд. Дэпутатау. Паліцыя была скасована; заміж яе паставілі варту з народа, так званую міліцыю. 2 марта пачалі прыходзіць весткі у Петраград, што Масква і іншыя вялікія гарадэ гэтак сама паусталі.

Выканаучы Камітэт Гасуд. Думы, парадзіушыся з Рабоч. і Салдац. Дэпутатамі, выбрау новае міністэрства, або Урад. Гэты новы урад—часавы. Ен будзя кіраваць дзяржавай і трымаць уладу да таго часу покі зьбярэцца Установчы Сэйм. Установчы Сэйм, адтрымаушы паунамоцтва ад усяго народу, ужо сам разважыць пытаньня, які парадак у нас запануе і кім будзя кіравацца. Часовы Урад пакляуся даць амністыю за усе палітычныя і рэлігійныя справы, свабоду прамовы, друку, хаурусау і сходак, скасаваць рэлігійныя і панскія прывілеі, замяніць паліцыю народнай міліцыяй ды як найхутчэй склікаць Установчы Сэйм.

Старая уладарства ужо ня істнувала. Мікалай II мусіу зрачыся прастолу на карысьць, як ен пісау, свайго брата, Міхала. Але і той, перапалоханы народным гневам, ня адважыуся узлажыць на сябе царскае кароны ды гэтак сама зрокся. Уся улада перэйшла да рук самаго народу. Народ сам стау царом сваім і гаспадаром жыцьця свайго. Вось што заваявау народ у буры рэвалюцыйнаго дзейства!

Першаю прылучылася да новаго парадку Масква. Там войска адразу пайшло за народам, і моцныя муры царызма былі хутка паломаны. Рэвалюцыйны віхар шпарка паімчауся па усей Расеі. усе пазьмятау, счысьціу і над Расеяй узышло Слонца свабоды.

Цяпер Расея вольна, але многа працы наперадзі, покі адбудуецца новае лепшае жыцьце.

Я. Л.

Друк і жыцьця.

Пад уплывам ваеннай калатніны. Польшча адтрымала сабе пізалежнасьць Яе самабытнасьць прымушаны прызнаць немцы, згадзілася на гэта і Расея. Пазнала Польшча, пачым хунт ліха і, трэба спадзявацца, што ня пакваніцца яна на чужое ды ня стане рабіць з другімі таго што з яе рабілі іншыя. Тым часам, «палякі з Літвы і Беларусі» пазіраюць па справу пачай. Рух беларускі расьце і шырыцца, а сэрца перакінчыкау сціскаяцца жахам і распачу. Адрокшыся свае бацькаушчыны і перакінуушыся да палякоу, гэтыя здрайцы і рэнэгаты зямлі беларускай падымаюць лямэнт. Мабыць чуе іх Юдава сэрца, што і у Польшчы іх ня прымуць і Беларусь адцураяцца. Ды вярадуюць, бо здрада нікому ня даруяцца.

Цікавыя звесткі аб гэтым знаходзім у № 31 «Газэты Польскай». Як адчынілася Тымчасовая Рада у Варшаві, дык гурток кабет з Беларусі паслау прывітальную адрэсу, у каторай памеж іншым чытаям:

«Ня адварочывайце вачэй і думак вашых ад таго няшчаснаго краю, каторы больш, як сто год, церпіць мукі за сваю польскасьць, дзе польскасьць усе больш і больш шырыцца, —ад таго люду, каторы цяпер, сярод гуку гармат і агню, стыхійна кідаяцца да польскай школы і працягвая рукі за польскай кнігай. Ваша павіннасьць дбаць ня толькі пра Польшу, але і пра Літву (Беларусь). На моцы гэтаго, мы зьвяртаямся да вас і просім: ратуйце нас! Ратуйте тую велічыню, тую найпякнейшую часьціну народу! Ратуйце бацькаушчыну Касьцюшкі, Рэйтана, Міцкевіча,—бацькаушчыну Ягелапау».

Гэтак лямэнтуюць людзі, трапіушыя у багну. Крычыце, васпані, мацней, бо ніхто вас ня чуе.

Здрайцы іншаго гатунку,—маскоускія перэкінчыкі, выступаць публічна, у друку, ня адважываюцца. Напуджаныя магутным рухам народа, гэтая чорная сотня маскоускаго боку пахавалася недзя у шчылінах і толькі, калі ні калі, паказвая свае зміінае джала па закуткам, пыкае і плюе ядавітую сьліну на усіх шчырых сыноу нашай бацькаушчыны. Гэтым шляхэтным дзелам займауся з'езд вучыцялеу Мінскага павету і губэрніі.

Пе, панове, ні памогуць вам ні тыя брудныя памыі, у якіх вы купаяцяся, ні маскоускія абрусіцялі дэмакратычнага стану. Проч з дарогі! Беларусь жыла, жыве і жыць будзя і ня пойдзя яна ні за Польшчай, ні за Маскоушчынай, а сваім уласным, беларускім шляхам.

Дзесяць прыказаньняу для памяці.

I.

Кожын праваслауны Беларус павінен ведаць, што ен не расеяц; а каталік—што ен не паляк. Памятайце, што вы не проста «тутэйшые людзі», а **беларусы**.

II.

Не саромся, беларус, гаварыць па сваяму—на роднай мове бацькоу і дзядоу сваіх. Шануй сваю мову, шануй свае песьні, свае казкі, звычаі і усе роднае—гэта спадчына дзядоу і вялікі нацыанальны скарб.

III.

Богу маліцца трэба толькі па свойму, тады вы добра зразумеіце тое, што вы гаворыце. Дзяцей навучаць трэба толькі на роднай мове, тады навука прынясе шмат карысьці.

IV

Толькі тады цябе усе будуць шанаваць як чэлавека, калі сам сябе шанаваць будзеш—калі не аткінеш свайго нацыанальнаго уласнаго багацьця. А першы скарб нацыанальны—гэта родная мова.

V.

Толькі на роднай, добра зразумелай мове, чэлавечы розум развіваецца і багаціць родную духоуную і эконамічную культуру.

VI.

Культура кожнай нацыі па асобку прыносіць карысьць агульна чэлавечай культуры—усяму сьвету. Так сама і мы, беларусы, прынясем карысьць усім людзям на зямлі толькі тады, калі яны у нас пабачуць нашэ асобнае, вытваронае намі, а не пазычанае у палякоу або у расейцау. Фундамэнтам гэтаго есьць толькі родная мова.

VII.

Быць беларусам гэта значыць, працаваць дзеля свайго краю, дзеля свайго народу і развіваць сваю культуру і штукарство. Так сама шанаваць усе другіе нацыі—«свайго не чурайся і чужому навучайся!»

VIII.

Кожын з нас павінен памятаць і ведаць, што наша беларуская мова ня горшая ад другіх моваў; толькі на нашай мове было наумысьне забаронено пісаць і друкаваць кнігі дзеля таго, каб мы аставаліся цемнымі людзьмі і каб былі парабкамі чужых, болей разумных людзей. Ведайце, што некольні соткау гадоу таму назад на нашай мове пісаліся законы у гэтым краю і друкаваліся розные сьвятые і сьвецкіе кнігі.

IX.

Той чэлавек, каторы называе нашу мову «мужыцкай», «хамскай» і кпіць з яе, гэто або правакатар, або без розуму. Бо мова, на якой гаворыць дзесяць мільенау людзей, мае права быць нарауне з усімі другімі мовамі і развівацца праз друк і кнігі. У той час, калі паны расейскіе гаварылі толькі па француэку, сьмеяліся і з расейскай мовы і саромiліся яе.

X.

Тые людзі, с палякау ці з расейцау, каторые скажуць вам: «Кіньце сваю бедную, неразвітую мову і прылучыцеся да нас—мы вам дадземо усе гатовенькае!»—гэта, памятайце, такіе людзі, што хочуць найдалей закабаліць вашу душу —ня ідзіце за імі! бо страціце свае імя і зробіцеся нявольнікамі духа, грунтам для чужых.,

Толькі тады чэлавек вольны—калі мае усе свае.

Я—р.

ХРОНІКА.

25 сакавіка адбыуся у Мінску з'езд беларускіх дзеячоу, тых людзей, што здауна працуюць на карысьць роднаго краю. На зьездзі выбраны Беларускі Нацыанальны Камітэт. У склад яго узяйшлі 10 соцыалістау беларускай соцыялістычнай грамады, 3 соцыалісты іншых партый, а усяго у Камітэці 18 чалавек.

Камітэт выбрау с паміж сябе прэзідзіум з 5 чалавек. За старшыню стау Раман Скірмунт, дэпутат I Госуд. Думы.

Зьезд пасылау у Петраград да Часового Ураду і Рады Р. і С. Дэпутатау дэлегацыю. Там іх стрэлі вельмі прыхільна і абяцалі старацца, каб нашаму многа пакутнаму народу было роунае права з іншымі народамі.

Пачуушы гэта, у Мінску чыноунікі з Расеі і тутэйшыя перэкінчыкі падпялі гвалт. Смачна мабыць ім жылося тут пад апекаю царызма і жандармау. Спакойна і ні турбоуна. Сядзелі тут, пісалі ды „тварылі волю паслаушаго іх царызма". І ні разу ні падумалі, дзе яны,

---

Апаведаньня без назвы.

I.

Яухім-Плашка.

Татулька наш—скарбовы рыбак і кіраунічы у рыбацтві, мэрам той сотнік ці ротман у плытніцтві. Ен любіць свой талант і талянтуе рыбацтвам дауно, як запамятаць. Увесь двор наш, платэ, усе жэрдкі пад стрэхамі абчэпляны розным рыбацкім начэнням. Але не шукайце, бо німашака у нас трох рыбацкіх рэчау: тапчана, бродня і вудау. Гэтым начэнням татулька гаиьбуе і ні вельмі шануе таго, хтой мае яго.

—Вудаю, кажа ен: ловіць гультай, тапчаном-дурань, а бродням—бабы.

Вось Цыбаты Яухім, або Плашка, чалавек і ні кепскі, а татулька няузлюбіу яго за тапчан, як чорт зна за вошта.

Яухім натта густуе сьвежую рыбу, і пад сьвяты дзень хібіць не можа, каб не зьбегау у тонь ці у Немнішчэ.

Летась, на Уттесця, заснуу ен у цэркві ды ма быць, сасніу, што сом той ці мсятус выслізнуу с торбы, бо нарабіу лямэнту на усю царкву:

—А братке ж вы мае, уцек!.. Вялізны, як плашка!..

Часам ен сам, здароу, бачыць, што ні час яму ні кошкацца з рыбай, што у дому ніупраука, збожайка плача, жонка сярдуе, крычыць, вярадуе і, здаецца, ніхай-бы яе пярун спаліу з гэстаю рыбай, дык, бачыш, стрымацца ня можа. А вырвецца з дому—з гарматы не спыніш...

Заходзіць сонца. Аздобна і пекна у паветры, як на Вялікдзень у хаці. Крэучык як со сну бомкае у цэркву. Абвязаушы хусткамі твар ад загару, мятуць каля хатау дзяучата. Мыюць у гаспадах, прыбіраюць з надворка. Пасыпаюць жоутым пясочкам прызбы, падворныя сцежкі ды весяла гудзяць, жартуюць, смяюцца. А дзеці у коні гуляюць. Усеушы на палкі, або пабраушы, як цуглі, аборкі у зубы, гасаюць па вуліцах то узад, то уперад, покі ня зморацца, або не паб'юцца.

Варочаюцца с поля, з работы. Рыпаюць дзьверы, скрыгаюць студні, рыпяць, як рагочуць ворота. Веска гудзе і шамоча, як вуляй у вечар... Патаміліся людзі—ходзюць паціху, гаворць спавагу. Прыветоы і рады, што заутрайка сьвята і ольнна часіна. І кожан ахвотна і рупне прыгладжвае ыопус тыдневае працы... Яаухім-жа тым часам імшчыцца на рыбу.

І мусіць ня рыба цікавіць Яухіма і ні карысьць ім кіруе, як ні карысьцю й жадобой кіруецца той паляунічы, што страляе качак на рынку, ідучы дамоу с паляваньня. Яму проста прыемна паплюхацца у тоні, люба пабродзіць па цеплай вадзіцы, пабэрсаць нагамі лопух з расою ды, спрытна падняушы тапчан над вадою, борздзінька глянуць: осьць там штокольвек ці гола, як бубян? І кожан вечар, над сьвята, Яухім кляпецца і божыцца жонцы, што гэта-апошні ужо раз і калі на гэты раз нічога ня зловіць, дык ніхай яму рукі адсохнуць, калі дакранецца хоць пальцам да сеткі. А надыдзе нядзелька ці сьвята якое, выпадзе вечар харошы—тапчан зноу на плячы і Яухім зноу чэша на рыбу...

Каб лацьвей было бродзіць ды ямчэй варочаць нагамі у вадзе, дык ен, заміж портак, ускладзе жаночу спадніцу, а на себе, дзеля агульнай спрытнасьці, жончын мантон без рукава. Рудая ад брыдкай вады спадніца вісіць на ем, як на кію; мантон падраны, латка на латцы; спад мантона высмыкае падол паласатай, на кшталу жыдоускаго багамольля, сарочкі. На галаве аблаухая шапка з вушамі; спераду, на шыі, шэйдаецца каравая торба с пад рыбы, ззаду—дзеля асьцярожнасьці на вадзе, чырвоны кісет с тутуном. Вушы у шапцы цаляпаюцца на хаду, як у надворнай сьвіньні на бягу. У гэтым убранні Яухім копана тое страшыдла, што бабы ставяць з вясны па агародах на страх усяму варавітаму птаству. Трымаючы аднэй рукой тапчан на плячы, а другою-люльку у зубах, або апусьціушы другую зволына матацца у тахту, ен так шпарка сцігае і моцна ступае, што здаецца да бойкі ірвецца, альбо рыхтуецца скокнуць праз плот ці на муру. Вось татулька часам як зглезіць, як ен прэцца па вуліцы, мэрам той бусял па лузі, дык аж плюне. Потым адвернецца, страсяне галавою ды скажа:

—Мм-ы! Божа твая воля колькі таго глупства на сьвеці! Вунь зноу, абібок, пацыбау плюхацца у Немні.

Язэп Лесік.

у якім краю, чые душы яны калечуць. А калі блісьнула сонца вольнасьці і народ загаманіу вустамі сваіх лепшых сыноу, дык яны замятусіліся, як совы ад Божаго сьвету. І пачалі плясьці такое, што нікому ані сьнілося.

На селянскім зьездзі яны далажылі усіх сілау, каб абліць памыямі і аплюхаць гразею беларускую справу. Селяне ні разабралі прауды і паверылі сваім ворагам.

Але «брахнею свет пройдзіш, ды назад ня вернішся». Прауда заусёды пераможа. Як ні цяжка жылося пры царскім парадку, аднак дужэйшые людзі веры ня трацілі, а цяпер перад намі шырокі вольны шлях...

* * *

Беларускіе Камітэты закладаліся у Петраградзі, Магілеві, Бабруйску, Слуцку, Маладэчні, Асіповічах, Казані, Харкові, Яраслаулі, Марыуполі і у іншых мейсцох.

* * *

3 мая у Віцябску адкрыуся Беларускі саюз. Выбран Часовы Камітэт з 13 чал. За старшыню выбраны Полонскі. Разважаліся пытаньня аб аутономіі Беларусі, аб мові у школах, кооперацыуная і т. д. На Семуху ухвалена зрабіць літэратурны-вокальна-музыкальны вечар і скарбоначны збор ахвяр на патрэбы саюза.

* * *

13-15 мая у Мінску адбылася сэсія Беларускаго Нацыональнаго Камітэту. Камітэт апрацавау дэкляpацыю сваіх думак і мэтау і пастанавіу склікаць прэдстаунікау усіх беларускіх арганізацій і па асобных дзеячоу. Патрэбнасьць гэтаго з'езду ужо дауно адчувалася. Беларускі рух шырыцца, прылучылася шмат новых сілау, і усе павінны сказаць свае слово і даць дырэктывы Нацыональнаму Камітэту.

* * *

У Мінску 11 мая заложана «Таварыство Беларускай Культуры» с шырокімі культурнаасьвечнымі заданьнямі.

* * *

Так сама у Мінску арганізована першае Беларускае драматычнае таварыство пад назваю «Беларуская драма і камэдыя». 24 красавіка ставілі у Мінску «Паулінку» і «У зімовы вечар» пад кірауніцтвам Ф. Ждановіча. Спэктаклі так сама адбыліся у Слуцку і Бабруйску. Таварыство маніцца ехаць у Гомель, Магілеу, Віцябск і інш. мейсцы. Трэба, каб усюды беларусы памаглі і спагадалі свайму тэатру.

* * *

У Мінску заложана новая партыя „Беларуская Народная Партыя Сацыалістау". 22 мая партыяй склікан быу беларускі мітынг каля коннага рынку на Старажоускай вуліцы, а Мітынг быу [illegible]ць многалюдны.

* * *

Беларускае Т-во помачы ахвярам вайны хутка адкрывае колькі школ, і прытулкау.

* * *

9 мая у Маскве у будынку Унівэрсітэта адбыуся Мітынг. Зышлося шмат народу. Пастанавілі залажыць Беларускую Народную грамаду. Залажыліся асобные беларускіе гурткі— прафэсарскі, вучыцельскі, праваслаунаго духавенства і студэнцкая арганізацыя.

* * *

Ні у далекам часі мае быць конфэрэнцыя «Беларускай Соцыалістычнай Грамады» Мэта конфэрэнцыі--абгаварыць і прыняць праграму, а так сама выясьніць справы тактыкі у зьвязку с сучасным палітычным мамэнтам. Аб часі і мейсцу конфэрэнцыі будзе абвешчана асобна.

* * *

У г. Богородзіцку залажыуся «Беларускі Нацыанальны Гурток».

* * *

У Петраградзі было некалькі мітынгау Беларускай Сацыалістычнай Грамады. Народу зьбіралося многа, —найболыш салдат і работнікау – беларусау.

* * *

21 мая ксендз Гадлеускі прачытау у мініст. гімназіі на Прэабражэнскай вул. лекцыю «Беларусь і яе адраджэньне». Прыбытак пайшоу на карысьць „Беларускаго Таварыства помачы ахвярам вайны".

* * *

Так сама у Мінску 16 мая была прачытана лекцыя Шантырам на тэмат: «Патрэбнасьць нацыанальнаго жыцьця для беларусау».

Па Беларусі.

Ярэмічы, Навагруд. павету. (Ад уласнага карэспандэнта).

Пабег с палону.

Другога красавіка нашы разведчыкі спаткалі трох нашых салдатау, якія беглі з нямецкаго палону. Адзін з уцякачоу быу тутэйшы жыхар, родам з вескі, забрапае немцамі.

Будучы у палоні, ен папау як раз на работу у сваю веску, дзе і жыу астаушыся яго бацька. За гэтым немцы ні дужа сачылі за ім, і ен, ведаючы мейсцы навокала, згаварыушыся с таварышамі, паважыуся уцячы. Голац ня цетка,—кіняш і роднаго бацьку калі німа чаго есьці. Уцякаючы казалі, што хлеба у палоні давалі ім толькі па $^1/_2$ ф. у дзень, а мяса саусім бадай што ня давалі, бо яго у немцау і сваім салдатам ня хапае. Кажуць што у ход ідуць каты, сабакі, якіх скупляюць, шлюць на хвабрыкі ды робяць з іх кансэрвы. Наагул, жылося у палоні натта дрэнна...

Беглі с палона позна у вечар, па рабоці. Захапілі с сабою ножны, перарэзалі імі с калючаго дроту загародку і папаузлі далей, покі ня натрапілі на нашых разведчыкау.

М. Г-к.

* * *

М. Пясочная. 18 мая, раніцай, гэта выбух страшэнны пажар. Людзі ня знаходзілі ратунку ні сабе, ні свайму дабру. К поудню амаль ні ад усяго мястэчка застауся толькі попял. Пайшла да Бога сьвечкаю самая багатая частка мястэчка с крамамі. Страціушыя прытулак і хлеб людзі просяць помачы.

* * *

Н.-Свержан, Мінск. павету. Быу пажар а лагоднаго, працоупаго мястэчка у колькі гадзін засталіся адны руіны. Пагарэлі усе мейсцовыя інстытуцыі і жыдоускія сінагогі. Людзі засталіся пад адкрытым небам, бяз вопратак і хлеба. Патрэбна пільная помач.

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

ПЕТРАГРАД. Першая нарада аб праэкці выбароу да Устаноучаго Сэйму адбылася 25 мая.

ПЕТРАГРАД. Таварыш міністра харчавых спрау загадау па тэлеграфу, каб прымусова забіраць па рыначнай цане хлеб у селянскіх абшчэсцвяных магазынах.

ТАМБАУ. Ад гэтуль паведамляюць, што у Барысаглебскім павеці ляжыць многа хлеба, але перавезьці нікуды нельга, бо ня хапае вагонау.

КІЕУ. Адбылася нарада ген. Брусілова з міністрам ваенных спрау Керэнскім аб украінскім войску. Пастаноулянo укамплектаваць тры корпусы і называць іх украінскімі.

ПЕТРАГРАД. Надпіска на пазычку свабоды працягняна да 15-го іюля 1917 г.

КРОНШТАДТ. Мейсцовыя Рада С. і Р. Дэпутатау абвясцілі, што ня хоча слухаць Часоваго Ураду. Разам с тым, арыштавала дю пасадзіла у вастрог многа ахвіцэроу. Часавы Урад паслау туды міністрау Цэрэтэлі і Скобелева даведацца аб стасунках Рады С. і Р. Дэпутатау да Часоваго Ураду, аб становішчу абароны і інш.

ПЕТРАГРАД. На пасядзені Часоваго Ураду міністр судовых спрау зрабіу даклад на пытаньню аб арэштах дзеячоу старого рэжыма і іх прыхільнікау. Міністр сказау, што арыштована іх у розных мейсцах натта многа. Большасьць іх просіцца, каб іх або судзілі, або аслабанілі. Аслабаніць іх без суда нельга, бо народ гэтаго ня хоча. На моцы гэтаго міністр раіць наладзіць на мейсцох суды паветавые і губэрскіе у ліку 6 чалавек,— 3 ад Рады С. і Р. Дэпутатау і 3 ад грамадзянскіх арганізацый. У ліку апошніх трох—мейсцовы камісар. Гэты суд мае праву накладаць кару да 3 месяцау арэшту і гэтак сама ім даецца права высылаць.

ПЕТРАГРАД. Нарада пры міністэрстві, выслухаушы дэпутацыю украінскай цэнтральнай Рады у Кіяві аб будучым набудаваньні Украіны (аутаномія, украінізацыя пачатковых школ, камісар украінскіх спрау, арганізацыя украінскаго войска) пастанавіла зрабіць даклад часовaму Ураду на гэтым пытаньням.

ВАЙНА.

Праз апошнія тыдні на усіх фронтах было спакойна.

З 21 на 22 мая, у ночы, каля м. Крэва немцы прабавалі наступаць, але агнем нашае артылерыі былі супыняны.

* * *

Падауся у адстауку вярхоуны глаунакамандуючы генэр. Алексеев, а на яго мейсца часавы Урад прызначыу генэрала Брусілова.

* * *

Братаньне. Нямецкіе палонные расказваюць, што было загадана, каб яны пры братаньні з рускімі салдатамі выглядалі нашы пазыцыі. Дзеля гэтаго яны раздавалі гарэлку нашым салдатам, а самі тым часам аглядалі усе, што ім цікава і патрэбна было.

* * *

У Мінску гурток кабет маніцца залажыць першы жаночы легіон, каторы мае займаць службы вартаунічых у тылу. Да легіону заклікаюцца усе кабеты, каторыя спагадаюць іх думцы і ня маюць сямьі ці наагул вольны у сямейным жыцьці.

Тэлеграмы.

Беларускаму Нацыональнаму зьезду, бывшаму 25-26 сакавіка.

Слуцк. У трываласьці умацавалася Беларусь. Згінула сумная мынуушчына, адчыніліся дзьверы у будучыну валікіх магчымасьцяу. Цярпеушым—слава, памяць і любасьць, зьезду-братэрскае прывітаньне.

Ж. Абрамовіч

Петраград. Гурток беларускіх жанок „Пралеска" вітае вольны беларускі нацыанальны зьезд і мае надзею, што ен голасна выславіць радасьць вольнае беларускае кабеты.

«Пралеска».

Петраград. Гурток вучняу— уцякачоу горача вітае зьезд і выяуляе гатоунасьць разам працаваць на карысьць роднай старонкі.

Слуцк. Сэрцам і думкамі з вамі. Разводзье затрымала мяне. Прыміця пажаданьне, каб як найхутчэй адрадзіуся беларускі народ.

Булгак.

Арол. Арлоускіе уцякачы—беларусы, зышоушыся на першай вольнай беларускай вечарынцы, горача вітае беларускі зьезд.

Маркевіч, Ждановіч, Грабоускі, Іваноускі.

Петраград. Беларускoе выдавецтво „Загляне сонца і у наша аконца" вітае першы вольны нацыанальны зьезд і спадзяецца, што ужо глянула слонца і у наша аконца.

Выдавецтва.

Столін. Першы вольны сход грамадзян палякау Пінскаго павету, што адбыуся у мястэчку Століне, пасылае братэрскае прывітаньне беларускому народу, спадзяючыся разам працаваць на карысьць і дабро роднаго краю.

Станіслау Радзівіл.

Петраград. Ня маючы змогі прыехаць, просімо перэдаць першаму беларускаму зьезду прывітаньне, і пажаданьне, каб найхутчэй збыліся нашыя народныя ідэалы.

Будзька, Хведзька.

Харкау. Сходка беларусау места Харкава горача вітае зьезд беларускіх дзеячоу і просіць паведаміць аб праграмі і заданьнях зьезду.

Самковіч.

Чынная армія. Браты беларусы! Пасылаям шчырае прывітаньне і найлепшыя пажаданьня зьезду. Хай Вам Бог дапаможа!

Дзеніс Котляроу.

Петраград. Горача вітаючы першы вольны беларускі зьезд жадаям удачы і карыснай працы дзеля роднаго краю.

Радзевіч, Рансімовіч, Свылань, Столыгва.

Ліст у рэдакцыю.

Рада беларускіх Дэпутатоу у Казані на экстраным заседаньні 3-мая 1917 году, выслухаушы даклад Ф. Стульбы аб рэзалюцыях на селянскім зьездзе у Мінску 22-га Красавіка (апрыля) і аб заявах старшыні зьезду Міхайлова аб «Беларускім Нацыанальным Камітэці» і «Беларускай соцыалістычнай грамадзе», аднагодна пастанавіла:

1)—Протэставаць проціу настаноу з'езду абрусіцельнаго характару.

2)—Прызнаць заяву старшыні Міхайлова аб тым, што «Беларускі Нацыанальны Камітэт»— панская інтрыга і што у «Беларускай Соцыалістычнай Грамадзе» замешаны паны, правакацыйнай і скіраванай, каб разлучыць беларускі народ.

3)—Беларускі Нацыанальны Камітэт прызнаць кіраунікoм усяе беларускае нацыі.

4)—Прызнаць, што Беларуская Соцыалістычная Грамада адбівае жаданьня беларускага працоунаго народу.

Старшыня прапаршчык
Станкевіч.
Пісар Салдат
Борк.

Чарговы № „В. Б." па тэхніч. варунк. спозніцца і выйдзе праз тыдзянь.

Рэдакцыя.

РЭДАКЦІЯ

„ГРАМАДЫ"

будзе старацца выдаваць газэту што тыдзень.

Кожын номер каштуе 8 капеяк

а с перасылкай 10 капеяк

падпісуйцеся адразу на 10 нумяроу

без перасылкі 80 кап.

с перасылкай 1 рубель

Да канца года с перасылкай —3 рублі

Гропы і матар'ялы высылайце на імя

РЭДАКЦЫІ

Мінск, Захароускі завулак д. 6.

Абвесткі на апошняй страніцы па 20 коп. за радок.

Выдавец — «Беларускі Нацыанальны Камітэт». Друкарня Грынблата, Мінск. Рэдактар— Я. Лесік.